УДК 94(476)

# НЕЗАЛЕЖНАЯ БЕЛАРУСЬ: ДЗЯРЖАВА І ГРАМАДСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ Ў АДНОСІНАХ З ДЫЯСПАРАЙ (1992–2017 гг.)

**Крумкач В. Ю.**
Шклоўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей
(г. Шклоў, Беларусь)

Анатацыя. Артыкул прысвечаны зменам ва ўзаемаадносінах краіны і беларускага замежжа з 1991 года, а менавіта: афіцыйныя кантакты, заканадаўчае замацаванне адносін, супрацоўніцтва ў сферы культуры, эканомікі, палітыкі, правядзенне розных мерапрыемстваў і г. д.

Ключавыя словы: дыяспара, беларускае замежжа, эміграцыя.

Summary. The article is devoted to the changes in the relations between the country and the Belarusian abroad since 1991, namely: official contacts, legislative consolidation of relations, cooperation in the sphere of culture, economy, politics, holding various events, etc.

Keywords: diaspora, Belarusian abroad, emigration.

Абвяшчэнне незалежнасці Беларусі стала пачаткам фарміравання ўласнай міграцыйнай палітыкі. Важным крокам на гэтым шляху стаў Закон аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь (1991 г.), які заканадаўча замацаваў правы замежных суродзічаў і тых беларускіх грамадзян, якія жывуць па-за межамі краіны. Прынцыпова новым і істотным для суродзічаў за мяжой з'явілася захаванне права на набыццё грамадзянства за тымі асобамі, якія пастаянна пражывалі на тэрыторыі рэспублікі, але былі прымусова выселены ці выехалі за яе межы да ўвядзення ў дзеянне гэтага закона, а таксама за іх нашчадкамі. Такое ж права набылі і беларусы, а таксама асобы, якія ідэнтыфікуюць сябе як беларусы, і іх дзеці, што нарадзіліся за межамі сучаснай тэрыторыі Беларусі. Па закону грамадзянства ім прадастаўляецца на агульных асновах, за выключэннем неабходнага для іншых пастаяннага сямігадовага тэрміну пражывання ў Беларусі.

Прыняцце ў маі 1993 г. Закона аб парадку выезду грамадзян з Беларусі і ўезду ў яе (дзейнічае з 1 студзеня 1994 г.) адкрыла новыя магчымасці папаўнення дыяспары новымі мігрантамі, у тым ліку з захаваннем грамадзянства Беларусі (тыя, хто ўязджаў у часы СССР за мяжу, адразу пазбаўляліся грамадзянства). Гэты закон у адпаведнасці з прынцыпамі Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і іншымі агульнапрызнанымі міжнароднымі актамі гарантуе грамадзяніну Беларусі права свабодна пакідаць сваю краіну і вяртацца ў яе, рэгулюе парадак афармлення дакументаў для выезду за мяжу і ўезд у Беларусь.

У жыцці беларускай дыяспары пасля распаду СССР можна адзначыць новую з'яву – наяўнасць значнай колькасці працоўных мігрантаў. Яны не адносяцца ў поўным сэнсе да дыяспары, але некаторыя з іх з цягам часу становяцца паўнавартаснай часткай дыяспары. Найбольшы патокназіраецца ў краіны СНД і краіны Балтыі. Па структуры міграцыі Беларусі з краінамі СНД і краінамі Балтыі за перыяд з 1995 па 2005 г. доля Расіі склала 59,7%, Украіны – 17%, Літвы і Латвіі – па 1,7% [3, с. 117–119].

Апрача названых вышэй новых з'яў, пасля распаду СССР жыхары Беларусі змаглі больш даведацца пра існаванне сваёй дыяспары і сталі паступова наладжваць кантакты з беларускімі замежнікамі. Адкрыццём для грамадства стала існаванне беларускіх культурных цэнтраў, школ, музеяў у іншых краінах. Пры Міністэрстве культуры з'явілася каардынацыйная рада па справах беларусаў замежжа. Таксама з'явілася Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, усё гэта на афіцыйным узроўні і пры падтрымцы дзяржавы [7, с. 12]. Таварыства дружбы працуе з нацыянальнымі аб'яднаннямі даволі актыўна. Рыхтуюць разнастайныя мерапрыемствы, у якіх прымаюць удзел беларусы адпаведнай краіны.

Пры падтрымцы дзяржавы і непасрэдным удзеле дзяржаўных структур (па гэтай прычыне была прынята спецыяльная пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у чэрвені 1993 г.) і па ініцыятыве створанай грамадскай арганізацыі «Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына"» быў наладжаны спачатку з'езд выхадцаў з Беларусі, якія пражываюць у былых рэспубліках СССР, а затым першы з'езд беларусаў свету ў ліпені 1993 г. [5, с. 41–43].

Па выніках гэтых важных мерапрыемстваў была распрацавана і зацверджана першая ў гісторыі незалежнай беларускай дзяржавы Дзяржаўная праграма па падтрымцы суайчыннікаў і беларускіх арганізацый за мяжой "Беларусы ў свеце" (1993).

А ўжо на Трэцім з'ездзе беларусаў свету 6 ліпеня 2001 г. была ўхвалена праграма "Замежная беларуская супольнасць у XXI ст. (Асноўныя дзеянні па кансалідацыі і дапамозе беларускай дыяспары на перыяд да 2005 г.)". У гэтай праграме вылучаны адмысловы раздзел аб арганізацыі ўзаемадачыненняў у галіне навукі і адукацыі, дзе прадугледжана мацаваць сувязі беларускіх навукоўцаў на радзіме і за мяжой.

Акрамя з'ездаў беларусаў свету ладзяцца і іншыя мерапрыемствы (напрыклад, Міжнародная канферэнцыя "Культура і адукацыя беларускага замежжа"). Дзякуючы такім мерапрыемствам даследчыкі могуць дзяліцца культурнымі здабыткамі замежных суродзічаў, бо беларуская культура – гэта не толькі тое, што ствараецца ў метраполіі. Беларусы раскіданы па ўсім свеце, і культура беларускага замежжа багатая і разнастайная. І часам атрымліваецца, што ў замежжы яна захавалася лепш, чым на радзіме [2, с. 6].

Першая такая канферэнцыя была праведзена ў 1994 г. па ініцыятыве "Бацькаўшчыны" сумесна з Нацыянальным навуко-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ва-асветным цэнтрам імя Ф. Скарыны. Па выніках мерапрыемства было вырашана звярнуцца да ўрада Рэспублікі Беларусь з канкрэтнымі прапановамі па выкананні дзяржаўнай праграмы “Беларусы ў свеце”, а таксама, каб навуковыя даследаванні па культуры беларускага замежжа фінансаваліся ў ліку прыярытэтных; звярнуцца да Міністэрства адукацыі Беларусі, каб з новага навучальнага года былі ўведзены спецкурсы па культуры беларускага замежжа на гуманітарных факультэтах ВНУ [1, с. 3].

З мэтай захавання, даследавання і папулярызацыі дасягненняў беларускай дыяспары ў чэрвені 2014 г. пры падтрымцы ЗБС “Бацькаўшчына” пры Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва паўстала навукова-творчая ініцыятыва *“Цэнтр камплектавання і вывучэння дакументальнай спадчыны беларускага замежжа”*. А ў 2015 г. “Бацькаўшчына” падрыхтавала і перадала ва ўстанову частку архіва беларускай дыяспары, што захоўваўся згуртаваннем [11].

Увогуле, як падкрэсліў на V з’ездзе беларусаў свету міністр культуры Беларусі Павел Латушка, “Міністэрства культуры гатова і адкрыта да супрацоўніцтва як з грамадскімі арганізацыямі беларусаў за мяжой, так і з канкрэтнымі асобамі ў справах беларускай культуры, прэзентацыі культурных дасягненняў беларусаў замежжа на Бацькаўшчыне, прадстаўлення нашай культуры ў замежных краінах” [6, с. 55].

Асобнай часткай дыяспары з’яўляецца навуковая эміграцыя. Па статыстыцы, колькасць эмігрантаў-навукоўцаў, выехаўшых з нашай краіны ў 1996–2012 гг., склала каля 1000 чалавек. У сярэднім у гэты перыяд штогадова эмігрыравала 60–65 чалавек, пры тым гаворка ідзе толькі пра тых, хто страціў беларускае грамадзянства. Колькасць жа спецыялістаў навукова-тэхнічнай сферы, якія працяглы час працуюць за мяжой без страты грамадзянства Беларусі, складае прыблізна 4–5 тыс. чалавек. Сярод іх пераважаюць фізікі, матэматыкі, праграмісты. Трэба сказаць, што наша сітуацыя з інтэлектуальнай эміграцыяй не выключная. Больш важнае пытанне – гэта, што трэба зрабіць, каб прыцягнуць вялікі творчы патэнцыял беларускай навуковай дыяспары да развіцця навукі і эканомікі Беларусі.

Навукоўцы з Беларускага інстытута сістэмнага аналізу і інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай сферы (БелІСА) і Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі распачалі праект па вывучэнні беларускай навуковай дыяспары. Па яго выніках была выдадзена брашура, якая змяшчае ідэі, як развіваць супрацоўніцтва з былымі суайчыннікамі. У аснове гэтых рэкамендацый ляжыць міжнародны вопыт, а таксама паспяховыя прыклады ўзаемадзеяння з дыяспарай вядучых беларускіх навукоўцаў, якія ў ходзе праекта падзяліліся сваім вопытам “навядзення мастоў”. Хай гэта невялікае дасягненне, але справа гэтая патрэбная і важная.

Акрамя таго, была створана база дадзеных “Беларускія вучоныя ў замежжы”, дзе змяшчаецца інфармацыя пра 560 з’ехаўшых вучоных. Гэты спіс складзены пры дапамозе Міністэрства замежных спраў і беларускіх вучоных, падтрымліваючых сувязь з землякамі, ён пастаянна пашыраецца. База адлюстроўвае звесткі толькі пра 8–10% вучоных за мяжой, але дазваляе аналізаваць, дзе знаходзяцца цэнтры канцэнтрацыі былых суайчыннікаў, у якіх накірунках яны працуюць і хто з іх супрацоўнічае з Беларуссю. Па інфармацыі БелІСА, супрацоўнічае з нашымі навуковымі цэнтрамі прыкладна трэць вучоных-эмігрантаў, а сярод прымаючых краін лідыруе ЗША (23%), Расія (16%), Польшча (11%), Германія (11%), Канада (6%), Вялікабрытанія (5%) [10, с. 8–9].

Такім чынам, на працягу 1990–2000-х гг. стварыўся новы механізм узаемадзеяння дзяржавы і эмігрантаў. Акцэнт рабіўся на падтрымку культурнай, адукацыйнай дзейнасці. У выніку ў 1990-х гг. суайчыннікамі, якія пражываюць па-за межамі рэспублікі, было створана звыш 130 грамадскіх аб’яднанняў. Таксама пачалі дзейнічаць школы і класы па вывучэнні беларускай мовы ў месцах кампактнага пражывання беларускай нацыянальнай меншасці. Такія цэнтры і школы адкрыліся ў Вільнюсе, Рызе, Даўгаўпілсе, у больш чым 20 рэгіёнах Расіі, Польшчы, дзе ў Беластоку ў 2007 г. у адпаведнасці з рашэннем урада Рэспублікі Беларусь пачаў працу Беларускі культурны цэнтр, створаны непасрэдна на сродкі дзяржавы.

Па лініі Міністэрства адукацыі здзяйсняецца практычная дапамога ў стварэнні беларускіх школ і класаў. Па лініі Міністэрства культуры шматлікія калектывы мастацкай самадзейнасці замежжа, а іх створана звыш 100, забяспечваюцца нацыянальнымі касцюмамі. Адбываецца творчы абмен с прафесійнымі калектывамі рэспублікі. Міністэрства інфармацыі перадае беларускім арганізацыям кнігі беларускіх аўтараў, творы пісьменнікаў замежжа друкуюцца ў Беларусі. Міністэрствам падтрымліваецца дзейнасць рэдакцый газет, якія выдаюцца ў замежжы. Са стварэннем Дзяржаўнага камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей праца з беларускім замежжам стала больш сістэмнай, яна ахоплівала амаль усе сферы дзейнасці.

Што датычыцца ўжо XXI ст., то кіраўніцтвам дзяржавы ў 2008 г. была прынята новая канцэпцыя ўзаемадзеяння з суайчыннікамі за мяжой, згодна з якой значна пашыраны накірункі дзейнасці, асновай культурнага супрацоўніцтва становяцца гандлёва-эканамічныя кантакты. Таксама распрацаваны комплекс мер для тых суайчыннікаў, якія жадаюць вярнуцца ў краіну для наступнага пражывання, – захаванне працоўнага стажу, атрыманне пенсій і шэраг іншых сацыяльных праблем.

З мэтай супрацоўніцтва дзяржавы з замежжам пры Апараце Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей у 2009 г. створаны Кансультацыйны савет кіраўнікоў грамадскіх аб’яднанняў суайчыннікаў, якія пражываюць за мяжой. У яе склад увайшлі 24 прадстаўнікі з Расіі, Літвы, Латвіі, Польшчы, Украіны, Малдовы, Эстоніі, таварыстваў “Бацькаўшчына”, “Радзіма”, МЗС Беларусі і інш. [12, с. 6].

Знакавай падзеяй стала прыняцце закона “Аб беларусах замежжа” (ад 16 чэрвеня 2014 г.). Згодна з ім “беларусы замежжа – асобы, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь і ідэнтыфікуюць сябе як беларусы або з’яўляюцца выхадцамі з тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь”.

Акрамя таго, “да беларусаў замежжа адносяцца наступныя асобы: грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь; замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь і самі або іх продкі па прамой узыходзячай лініі нарадзіліся або пражывалі на тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь; замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь і ідэнтыфікуюць сябе як беларусы з пункту гледжання этнічнай прыналежнасці да беларускага народа або беларускай мовы, культуры, гістарычных сувязей, ведання і захавання беларускіх традыцый і звычаяў” [4].

Дзяржаўнае рэгуляванне і кіраванне ў галіне адносін з беларусамі замежжа ажыццяўляюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, урадам Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцей, абласнымі і Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі. Прэзідэнт вызначае агульны напрамак палітыкі ў адносінах да дыяспары, урад Рэспублікі Беларусь забяспечвае рэалізацыю агульнай дзяржаўнай палітыкі; зацвярджае дзяржаўныя праграмы і ажыццяўляе кантроль за іх рэалізацыяй.

Асноўныя мэты дзяржаўнай палітыкі:

– садзейнічанне захаванню нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці беларусаў замежжа;

– аказанне садзейнічання беларусам замежжа ў рэалізацыі імі нацыянальных, культурных і іншых правоў з улікам агульнапрызнаных прынцыпаў і норм міжнароднага права, заканадаўства дзяржаў грамадзянскай прыналежнасці і пастаяннага месца жыхарства беларусаў замежжа;

– выпрацоўка дзейсных механізмаў падтрымкі беларусаў замежжа для задавальнення культурных, інфармацыйных, моўных і іншых патрэб беларусаў замежжа;

– умацаванне сувязей паміж беларусамі замежжа і Рэспублікай Беларусь;

– выкарыстанне патэнцыялу беларусаў замежжа для развіцця беларускай дзяржавы, у тым ліку для наладжвання рознабаковага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з замежнымі краінамі;

– стварэнне спрыяльных умоў для беларусаў замежжа, якія прынялі рашэнне пераехаць у Рэспубліку Беларусь на часовае ці пастаяннае месца жыхарства [4].

Асноўную працу па рэалізацыі праграмы супрацоўніцтва выконвае Кансультатыўны савет па справах беларусаў за-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

межжа пры Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Парадак і мэты яго дзейнасці прапісаны ў спецыяльным заканадаўчым акце – Палажэнні аб Кансультатыўным савеце па справах беларусаў замежжа пры Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь ад 27.11.2010 г.

"Савет з'яўляецца дарадчым, кансультацыйным і экспертным органам, які ўдзельнічае ў абмеркаванні найважнейшых аспектаў, ініцыятываў, у тым ліку праектаў нарматыўных прававых актаў, накіраваных на правядзенне максімальна эфектыўнай дзяржаўнай палітыкі ў галіне адносін з беларусамі замежжа" [8].

У выніку апошняга VI з'езда беларусаў Свету ў 2013 г. Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 3 снежня 2013 г. №1035 зацверджана Дзяржаўная праграма супрацоўніцтва з беларусамі замежжа "Беларусы ў свеце" на 2013−2015 гг. Дзяржаўная праграма накіравана на забеспячэнне комплекснага ўзаемадзеяння органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх аб'яднанняў Рэспублікі Беларусь з беларусамі замежжа, далучэнне беларускай дыяспары да ўдзелу ў рэалізацыі праграм сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Рэспублікі Беларусь, захаванне і падтрымку яе нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці. Мэтай Дзяржаўнай праграмы з'яўляецца стварэнне сістэмы дзяржаўнай падтрымкі і развіцця партнёрскага супрацоўніцтва з беларусамі замежжа ў сацыяльна-эканамічнай, інфармацыйнай, адукацыйнай, культурнай і іншых сферах. Заказчыкам-каардынатарам Дзяржаўнай праграмы вызначана Міністэрства культуры [13].

З 2016 г. рэалізуецца праект "Административный регион Беларуси – организация соотечественников за рубежом", створаны для наладжвання супрацоўніцтва паміж суайчыннікамі за мяжой і рэгіёнамі Беларусі.

Таксама дзейнічае падпраграма "Беларусы ў свеце" ў рамках дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" на 2016–2020 гг. [15, с. 1].

15–16 ліпеня 2017 г. у Мінску прайшоў Сёмы з'езд беларусаў свету пад тэмай "Беларуская нацыя, беларуская дзяржаўнасць, беларускае замежжа – выклікі сучаснасці і стратэгіі развіцця" [14]. Акрамя таго, згодна рашэнню Мінгарвыканкама,на набярэжнай Свіслачы ўсталяваны памятны знак "Беларусам свету" [9]. З аднога боку, гэта дэманструе ўвагу дзяржавы да пытання ўзаемадзеяння з дыяспарай, а з іншага – гэта яшчэ адзін факт, які пацвярджае ўсё большае ўмяшанне ў справы грамадскіх арганізацый накшталт "Бацькаўшчыны" і імкненне праводзіць сваю лінію праз іх.

За перыяд незалежнасці краіны быў зроблены значны крок наперад у адносінах з дыяспарай. Па-першае, пераадолена варожае стаўленне да суайчыннікаў за мяжой і наладжаны кантакты на розных узроўнях, па-другое, прыняты цэлы шэраг праграм па супрацоўніцтву дзяржавы з дыяспарай, падтрымцы суродзічаў за мяжой. Акрамя таго, рэгулярна з 1991 г. пачалі праводзіцца канферэнцыі, з'езды беларусаў свету і г.д.

Але ўсё роўна застаецца шэраг складанасцей і пытанняў ва ўзаемаадносінах краіны-метраполіі і дыяспары.

**Літаратура:**


1. Астрога, В. Гісторыкі-ўсходазнаўцы беларускага паходжання (1917–1991) / В. Астрога // Кантакты і дыялогі. − 1999. − № 11–12 (лістапад-снежань). – С. 10.
2. Бандарэнка, Т. "Кропля вады ў вядро дадаецца". Культура беларускага замежжа / Т. Бандарэнка // Голас Радзімы. – 1994.− 30 чэрвеня. – С. 3.
3. Гриценко, Д.В. Миграция населения между Республикой Беларусь, приграничными государствами СНГ и странами Балтии: региональный анализ / Д.В. Гриценко // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя гуманітарных і грамадскіх навук. – 2008. – № 2. – С. 116–122.
4. Закон Рэспублікі Беларусь 16 чэрвеня 2014 г. № 162-З "Аб беларусах замежжа" // Эталон – Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://mfa.gov.by/mulateral/diaspora/. – Дата доступу: 09.01.2019.
5. Канус, К. "Мы не пасынкі твае, Беларусь" [Першы сход беларусаў блізкага замежжа] / К. Канус // Беларуская мінуўшчына. – 1993. − № 1. – С. 41–43.
6. Кушнер, В. V з'езд беларусаў свету / В. Кушнер // Беларускі гістарычны часопіс. – 2009. − № 11. – С. 50–55.
7. Мінкевіч, Л. Дзеці адной краіны/ Л. Мінкевіч // Народная газета. – 2010. – 9 снежня. – С. 12.
8. Палажэнне аб Кансультатыўным савеце па справах беларусаў замежжа пры Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://mfa.gov.by/mulateral/diaspora/. – Дата доступу: 09.09.2018.
9. Памятны знак "Беларусам свету" ўсталюють на ўзбярэжжы Свіслачы да 950-годдзя Мінска [Электронны рэсурс] / Рэжым доступу: http://zbsb.org/node/11601. – Дата доступу: 10.11.2018.
10. Патыко, Д. Стоит ли разбрасываться мозгами? Белорусская диаспора – не "отрезанный ломоть" / Д. Патыко // Рэспубліка. – 2013. – 12 декабря. – С. 3.
11. Справаздача пра дзейнасць МГА "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" за 2015 год [Электронны рэсурс] / Рэжым доступу http://zbsb.org/node/10313. – Дата доступу: 15.11.2018.
12. Сурмач, Г. Жыве Беларусь у замежжы / Г. Сурмач // Наша слова. – 1999. – 24 сакавіка. – С. 6.
13. Шосты з'езд беларусаў свету [Электронны рэсурс] / Рэжым доступу: http://zbsb.org/node/8254. − Дата доступу: 09.01.2018.
14. 7 з'езд беларусаў свету [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://zbsb.org/node/11577. – Дата доступу: 12.01.2019.
15. Што дыяспара робіць для Беларусі? // Беларусы ў свеце. Інфармацыйны бюлетэнь. – 2018. – № 2. – С. 1.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова